# ПРАБЛЕМЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

**М. М. Аксенчык**

## АСАБЛІВАСЦІ ПРАСОДЫІ БЕЛАРУСКАГА СПАНТАННАГА МАЎЛЕННЯ

У пачатку XXI стагоддзя ўзмацнілася цікавасць айчынных лінгвістаў да вывучэння беларускай прасодыі. Былі дасягнуты значныя вынікі ў асвятленні розных аспектаў суперсегментнай фанетыкі. Была фундаментальна прааналізавана інтанацыйная сістэма беларускага маўлення (Л. Ц. Выгонная, Л. І. Сямешка), грунтоўна асвечаны пытанні рытму (Т. В. Паплаўская і Н. І. Князева), распрацаваны з'явы беларускай інтэрферэнцыі ў іншамоўным маўленні (Г. А. Мятлюк, Т. В. Паплаўская, Н. С. Еўчык, А. С. Селях, А. І. Даўгарукава, Е. А. Місуна, Л. Г. Шчарбакова, А. В. Сыцько), даследаваны фанастылістычны аспект (Т. Л. Дзергачова), распрацаваны асноўныя рэгіянальныя характарыстыкі маўлення (В. І. Курацёва). Усе інструментальныя даследаванні заснаваны на аналізе фанетычных з'яў у "статычных" эксперыментах з выкарыстаннем фрагментаў з мастацкіх твораў, навуковых артыкулаў і спецыяльна падрыхтаваных тэкстаў для радыёперадач. Атрыманыя вынікі папярэдняй навуковай працы ствараюць трывалую аснову для працягу даследаванняў і вылучэння новых вектараў. Адным з такіх напрамкаў у беларускім мовазнаўстве стала прасодыя спантаннага жывога маўлення, якая не была прадметам вывучэння. Трэба адзначыць, што быў глыбока распрацаваны сегментны аспект непадрыхтаванага беларускага маўлення, асноўная ўвага якога была накіравана на фанетычны аналіз гукаў, прагрэсіўных і рэгрэсіўных асіміляцый і рэдукцыі галосных (Т. Р. Рамза).

Прасодыя спантаннага маўлення – з'ява шматаспектная, шматслаёвая, абумоўленая камунікатыўнай сітуацыяй, эмацыйным станам удзельнікаў размовы і прадметам маўлення. Матэрыялам дадзенага эксперымента стаў дыялог, што адбываўся ў неафіцыйных нязмушаных абставінах, у разнавіднасці літаратурна-гутарковага стылю, вылучанага як інтэлектуальная размова. Удзельнікамі размовы сталі лінгвісты, якія карыстаюцца беларускай мовай ў штодзённым жыцці і распавядаюць аб працы над сваімі навуковымі даследаваннямі.

Падчас аўдытыўнага аналізу былі вызначаны 13 інварыянтаў акцэнтна-рытмічных груп, якія складаюцца з трох асноўных тыпаў: двух-, трох- і чатырохакцэнтных структур. Адсутнічаюць аднаакцэнтныя і пяціакцэнтныя структуры. Самыя высокія паказчыкі частотнаці (48,5 %) маюць двухакцэнтныя структуры: *ну, **проста** інтрыга**ва**ла*. Крыху ніжэй (41,5 %) колькасць трохакцэнтных структур: *у **той** галі**не**, якая табе пада**ба**ецца*. Колькасць выяўленых чатырохакцэнтных сінтагм складае 10,4 %, што сведчыць аб тэндэнцыі да ўжывання структур сярэдняй даўжыні.

У даследаваннях падрыхтаваннага беларускага маўлення, праведзеных іншымі даследчыкамі і зробленых на матэрыяле запісаў мастацкіх твораў, выказвалася меркаванне пра іншыя тыпы і частотнасць ужывання акцэнтна-рытмічных структур. Як найбольш частотныя былі выяўлены аднаакцэнтныя сінтагмы, агульная колькасць якіх складае 39 %. Двух- і трохацэнтныя сінтагмы сустракаюцца радзей і складаюць 33 % і 25 % адпаведна. Гэта можа быць растлумачана тым, што выкананне мастацкага твора характарызуецца прадуманай расстаноўкай лагічных і эмфатычных паўз, ужываннем уводных слоў накшталт *нарэшце*, *раптам*, *неўзабаве*. Іншая асаблівасць падрыхтаванага маўлення праяўляецца ў даволі рэдкім ужыванні чатырохакцэнтных і пяціакцэнтных сінтагм, толькі 3 % і 1 % адпаведна.

Дадзены эксперымент з мэтай аналізу жывой спантаннай гаворкі дазволіў выявіць тэндэнцыю да павелічэння працягласці найбольш ужывальных адзінак у параўнанні з даўжынёй акцэнтных груп падрыхтаванага маўлення. У той жа час адсутнасць пяціакцэнтных, цяжкіх для непадрыхтаванага маўлення сінтагм, сведчыць аб нетыповасці іх ужывання.

Такім чынам, асноўнымі рысамі акцэнтна-рытмічнай структуры спантаннага беларускага маўлення з'яўляюцца: ужыванне двух-, трох-, і чатырохакцэнтных сінтагм, адсутнасць аднаакцэнтных і пяціакцэнтных сінтагм, тэндэнцыя да больш частага ўжывання двух- і трохакцэнтных структур як адзінак сярэдняй даўжыні.

**В. У. Барысенка**

## АСАБЛІВАСЦІ ІСНАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ Ў НОВАЙ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ РЭАЛЬНАСЦІ

Практычна ў кожную эпоху абмяркоўваліся ідэі гуманізму і справядлівасці, але кожны раз гэтыя ідэі напаўняліся новым зместам. Сёння межы гэтых паняццяў значна пашырыліся. Гэта пэўны лад чалавечага жыцця, у якім спалучаюцца маральныя і прававыя пачаткі, агульначалавечыя каштоўнасці, спосабы жыць у свеце людзей, не падобных адно да аднаго. Актуальным становіцца міжрэлігійны дыялог, павага да розных культурных і рэлігійных традыцый. Сацыёлагі задаюцца пытаннямі: што адбываецца ў сучасным свеце з чалавекам, яго светапоглядам, каштоўнаснымі ўстаноўкамі; наколькі гэтыя змены новыя (маецца на ўвазе, што «няма нічога новага пад сонцам»); што нясе чалавечай асобе інфармацыйнае грамадства?

Аналіз сацыялагічных даследаванняў апошняга часу дазваляе зрабіць вывад, што сістэма каштоўнасцяў і стэрэатыпаў, якая склалася на працягу тысячагоддзяў у Еўропе, у XXI ст. ужо не ў стане ў поўнай меры забяспечыць існаванне і прагрэс чалавечай цывілізацыі, перажываючы сур'ёзныя змены ва ўмовах глабалізацыі. Працэс секулярызацыі часта прыводзіць да страты неабходнасці вышэйшага духоўнага пачатку, сканцэнтраванага ў рэлігіі. У якасці дамінуючых каштоўнасных арыентацый сталі сцвярджацца